ГАЗЕТА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА ІМЯ ФРАНЦЫСКА СКАРЫНЫ

# Гомельскі універсітэт



| № 16 (878) | Аўторак, 25 кастрычніка 1994г. | Газета заснавана ў верасні 1969 года | Выходзіць два разы ў месяц | Цана дагаворная |
|---|---|---|---|---|

## РЭСПУБЛІКАНСКАЯ НАВУКОВА-ПРАКТЫЧНАЯ КАНФЕРЭНЦЫЯ

На базе нашага універсітэта 18 і 19 кастрычніка праходзіла рэспубліканская навукова-практычная канферэнцыя, прысвечаная развіццю навуковых асноў удасканалення педагагічнай практыкі студэнтаў. Яе асноўным арганізатарам стала кафедра педагогікі, якая ажыццявіла ўсю падрыхтоўчую работу і выдала тэзісы выступленняў удзельнікаў канферэнцыі.

Уступным словам канферэнцыю адкрыў першы прарэктар ГДУ прафесар М.В.Селькін. Ён расказаў аб той рабоце, якая праводзіцца ва універсітэце па арганізацыі педагагічнай практыкі студэнтаў.

Са змястоўным дакладам аб суадносінах педагагічнай тэорыі і практыкі студэнтаў у школе і яе цяжкасцях выступіў загадчык кафедры педагогікі акадэмік І.Ф.Харламаў. У сваім дакладзе ён абапіраўся на ідэі Б.М.Кедрава і Л.С.Выгодскага і свой багаты вопыт кіраўніцтва педагагічнай практыкай студэнтаў.

Дацэнт В.П.Горленка расказала аб змесце практыкі і асаблівасцях фарміравання ў студэнтаў педагагічнага ўмельства як стратэгічнай мэце практыкі.

Цікавым было выступленне прафесара нашай кафедры М.А.Дзмітрыева аб авалоданні студэнтамі вопытам навучання і выхавання вучняў, які назапасілі творча працуючыя настаўнікі.

Важнае месца ў канферэнцыі было адведзена абмеркаванню арганізацыйнай дзейнасці студэнтаў па авалоданню прафесійна-педагагічнымі уменнямі і навыкамі. У абмеркаванні гэтай праблемы прынялі ўдзел выкладчыкі кафедры педагогікі Г.В.Гатальская, Н.А.Садоменка, аспіранты Н.І.Колтышава, Т.І.Зайцава,С.А.Вальчанка, Ф.Р.Котаў і аўтар гэтых радкоў. У канферэнцыі прынялі ўдзел метадысты і факультэцкія кіраўнікі практыкі С.І.Чарток, В.А.Ляшчынская, В.С.Генаш і інш.

З паведамленнямі на канферэнцыі выступілі таксама прадстаўнікі навучальных устаноў Мінска, Віцебска, Брэста, Мазыра. У ходзе яе работы распрацаваны метадычныя рэкамендацыі па далейшаму ўдасканаленню педагагічнай практыкі.

**Ф.КАДОЛ,**
дацэнт кафедры педагогікі.

## БЕЛАРУСКАЯ АКАДЭМІЯ АДУКАЦЫІ

Адбыўся ўстаноўчы сход, на якім заснавана Беларуская акадэмія адукацыі. Яе арганізацыямі-заснавальнікамі выступілі Міністэрства адукацыі і навукі, Беларускі дзяржаўны педагагічны універсітэт, Нацыянальны інстытут адукацыі, Рэспубліканскі інстытут прафесійнай адукацыі,Інстытут павышэння кваліфікацыі і перападрыхтоўкі кіруючых работнікаў і спецыялістаў адукацыі, Нацыянальны інстытут гуманітарных навук. Група вучоных -- сяброў Беларускага аддзялення Міжнароднай акадэміі навук вышэйшай школы выступіла ў якасці акадэмікаў-заснавальнікаў, сярод іх рэктар нашага універсітэта член-карэспандэнт АН Беларусі Л.А.Шамяткоў.

На ўстаноўчы сход былі запрошаны акадэмікі былой АПН СССР, у тым ліку загадчык кафедры педагогікі ГДУ І.Ф.Харламаў.

У ходзе абмеркавання вызначаны галоўныя мэты Беларускай акадэміі адукацыі.

Зацверджаным часовым Статутам прадугледжана абранне акадэмікаў і членаў-карэспандэнтаў з ліку вядомых вучоных у галіне адукацыі, творча працуючых педагогаў-даследчыкаў, настаўнікаў, арганізатараў адукацыі. У саставе акадэміі прадугледжана таксама калектыўнае членства ўстаноў адукацыі.

**Прэзідэнтам Беларускай акадэміі адукацыі абраны міністр адукацыі і навукі, доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар В.І.Стражаў.**

## ЦІКАВАЯ СУСТРЭЧА

адбылася на філалагічным факультэце. Госцем студэнтаў быў кандыдат філалагічных навук Алесь Лозка. Дарэчы, Алесь Юр"евіч з"яўляецца выпускніком аддзялення "Беларуская мова і літаратура" нашага факультэта, супрацоўнічаў ва універсітэцкай шматтыражцы. Зараз ён загадвае вучэбным цэнтрам нацыянальнай цацкі Міністэрства адукацыі і навукі. Многія ведаюць яго як аўтара змястоўнай кнігі "Беларускі каляндар".

Студэнты з вялікай увагай слухалі госця, які гаварыў аб адраджэнні нацыянальнай цацкі, а таксама аб ролі курса "Беларусазнаўства" ў сістэме нацыянальнай адукацыі. Алесь Юр"евіч адказаў на пытанні і падараваў кафедрам факультэта некаторыя свае працы.

**Л.КУЗЬМІЧ,**
кандыдат філалагічных навук.

## ПАВЕДАМЛЕННІ

**◆ 26 кастрычніка 1994 г. у ауд. 2-26 вучэбнага корпуса №5 адбудзецца справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя студэнтаў.**

**ПАРАДАК ДНЯ:**

1. Справаздача аб праведзенай рабоце.
2. Справаздача рэвізійнай камісіі.
3. Выбары новага складу прафкома.
4. Выбары рэвізійнай камісіі.
5. Выбары дэлегатаў на абласную канферэнцыю.

Пачатак работы канферэнцыі ў 12 гадзін.

**ПРАФКОМ СТУДЭНТАЎ.**

**◆ 31 кастрычніка 1994 г. у ауд. 2-26 вучэбнага корпуса №5 адбудзецца справаздачна-выбарная прафсаюзная канферэнцыя выкладчыкаў і супрацоўнікаў.**

**ПАРАДАК ДНЯ:**

1. Справаздача аб праведзенай рабоце.
2. Справаздача рэвізійнай камісіі.
3. Выбары новага складу прафкома.
4. Выбары рэвізійнай камісіі.
5. Выбары дэлегатаў на абласную канферэнцыю.

Пачатак работы канферэнцыі ў 14 гадзін.

На яе запрашаюцца кіраўнікі падраздзяленняў і ўсе жадаючыя.

**ПРАФКОМ.**

## ПРАВЯЛО НАБОР ПАДРЫХТОЎЧАЕ АДДЗЯЛЕННЕ

Як ні ў адным папярэднім годзе, сёлета аказалася шмат жадаючых вучыцца на падрыхтоўчым аддзяленні нашага універсітэта. На 75 планавых месц, як паведаміў яго загадчык кандыдат філалагічных навук В.І.Яцухна, прэтэндавала каля 300 чалавек. Кожны шосты з іх закончыў сярэднюю школу з медалём. Найбольш высокі конкурс аказаўся на спецыяльнасці "Беларуская мова і літаратура і англійская мова", "Біялогія", "Беларуская мова і літаратура", "Фізічная культура і спорт". Некаторыя слухачы залічаны на стацыянар з аплатай навучання.

Заняткі на падрыхтоўчым аддзяленні на стацыянары пачнуцца ў лістападзе.


**СЁННЯ Ў НУМАРЫ:**

- **1** Навіны апошніх тыдняў.
- **2-3** Яшчэ раз аб маралі.
- **4** Справаздачы і выбары ў прафсаюзе. Праграма міжнароднага фестывалю.
- **5-6** На літаратурнай арбіце.
- **7-8** Для вашага адпачынку.
- Мода (восень-94). Чэмпіёнамі сталі вучоныя.

# І КОНКУРС

## У ГАЛІНЕ ГУМАНІТАРНАЙ АДУКАЦЫІ І ГУМАНІТАРНЫХ НАВУК

Конкурс праводзіцца "Фондам Сораса -- Беларусь" з мэтай выявіць перспектыўных маладых гуманітарыяў, аказаць фінансавую падтрымку іх імкненню да прафесійнага росту і даць магчымасць праявіць сябе ў выбранай галіне ведаў.

Да ўдзелу ў конкурсе запрашаюцца маладыя гуманітарыі, якія не маюць вучонай ступені /студэнты, аспіранты, выкладчыкі/, ва ўзросце да 30 гадоў, здольныя да самастойнай творчай працы і арыентаваныя на сур'ёзную прафесійную дзейнасць у адной з гуманітарных дысцыплін.

На конкурс прадстаўляюцца праекты, якія ўключаюць:

1. Тэму навуковага або вучэбна-метадычнага праекта з абгрунтаваннем яе актуальнасці / 1-2 машынапісныя старонкі/.

2. Кароткі план-праспект мяркуемай работы /да 3-х машынапісных старонак/.

3. Завершаны аўтарскі тэкст аб'ёмам да 1 друкаванага аркуша.

4. Звесткі аб аўтары /прозвішча, імя, імя па бацьку, год нараджэння, месца працы або вучобы, адукацыя, сфера творчых інтарэсаў, дамашні адрас і тэлефон/.

На конкурс матэрыялы падаюцца ў 3-х экземплярах. Рукапісы не вяртаюцца. З адмоўнымі рэцэнзіямі аўтара не азнаёмліваюць. Апеляцыі не прымаюцца.

Пераможцы конкурсу атрымаюць гранты тэрмінам на 6 месяцаў, пачынаючы са студзеня 1995 года: другой катэгорыі -- 50 даляраў ЗША ў месяц, першай катэгорыі -- 30 даляраў ЗША ў месяц. Інфармацыю аб парадку атрымання грантаў пераможцы конкурсу атрымаюць да 30 снежня 1994 года.

Мяркуецца публікацыя найбольш значных прац, выкананых у рамках конкурсу.

Тэрмін падачы праектаў -- з 20 па 30 лістапада 1994 года.

Адрас: 220005, Мінск, вул. Казлова, 7, кв. 101. "Фонд Сораса -- Беларусь".

Тэл. /0172/ 33-04-61.





# ПАДАРУНАК АМЕРЫКАНСКАГА НАРОДА

Высокая ацэнка дадзена выкладчыкамі англійскай мовы паступіўшаму нядаўна ў ГДУ гуманітарнаму грузу. 1000 скрынак з кнігамі на англійскай мове сабрана дзякуючы цэнтру духоўнасці "Мировое видение" у штаце Каліфорнія ЗША і дастаўлена ў наш універсітэт. Цяпер выкладчыкам будзе значна лягчэй працаваць са студэнтамі, бо ў наяўнасці літаратура па самых розных напрамках -- гісторыі, сацыялогіі, псіхалогіі, біялогіі, заалогіі, развіццю бізнесу, маркетынгу, рэлігіі. Ёсць кнігі амерыканскай класікі, перакладная літаратура. Да таго ж сярод гуманітарнай дапамогі нямала кніг у дзесятках экземпляраў.

Цяпер работнікі бібліятэкі займаюцца апрацоўкай каштоўнага грузу.

На здымках: кнігі дэманструюць ст. бібліятэкар А.М.Мяснікова (справа) і бібліятэкар А.Д.Дэц; дастаўка гуманітарнай дапамогі ў сховішча і чытальную залу.

Фота У. Чысціка.

# ЕЩЕ РАЗ

"Да самому тебе, господину и жене, и детям, и домочадцам -- не красть, не блудить, не лгать, не клеветать, не завидовать, не обижать, на чужое не посягать, не осуждать, не бражничать, не помнить зла, ни на кого не гневаться, к старшим быть послушным и покорным, к средним -- дружелюбным, к младшим и убогим -- приветливым и милостивым, всякое дело править без волокиты и особенно не обижать в оплате работника, всякую же обиду с благодарностью претерпеть ради бога: и поношение, и укоризну, если поделом поносят и укоряют, с любовью принимать и подобного безрассудства избегать, а в ответ не мстить".

Как видно, речь в этом средневековом наказе идет о честности в самом широком смысле слова. Честность -- величайшее из достоинств человека, какое бы положение в обществе он не занимал, -- стала весьма уязвимым местом в характере и поведении современного обывателя, стремящегося к обладанию всеми благами цивилизации и не останавливающегося в этом всепоглощающем стремлении не только перед нравственными преградами, но и попирая, зачастую, законы, преодолевая даже страх перед расплатой за совершаемое преступление.

Честность стала, пожалуй, главным иммунодефицитом морали нашего тяжело больного общества.

Иной читатель, наверное, улыбнется, пробегая глазами эти строки:"Боже, да ведь нынче брось яблоко и попадешь в человека то ли злого, то ли бесчестного, то ли завистливого... Сколько же их сегодня и куда девались честные?"

Ну, а сколько у нас "несунов". Долгое время нам вдалбливали в головы, что в нашей стране все общее, что частный владелец -- злостный эксплуататор, что тот, кто много зарабатывает, либо рвач, либо "теневик", либо жулик, и потому враг... Так что же мы хотим? Отсюда отсутствие уважения к чужой собственности, к результатам чужого труда, отсюда бесхозяйственность и безответственность... И растаскивают по мелочам, а если кому повезет и если кто поможет, то и по крупному на десятки миллионов и миллиардов рублей "ничейного" добра.

Криминологи утверждают, что в основе любого преступления лежит искривленная нравственность. Конечно, в нашем обществе многое неустойчиво. Нас всех воспитывали







Вучацца першакурснікі, спасцігаюць сакрэты будучай прафесіі.

На здымках: на занятках па сістэмах сучасных тэхналогій, якія вядзе дацэнт М.У.Акуліч, студэнты спецыяльнасці "Эканоміка і кіраванне вытворчасцю".

Фота У.Чысціка.

# СТАНЬЦЕ ЎЛАДАЛЬНІКАМІ МІЖНАРОДНАГА СТУДЭНЦКАГА ПАСВЕДЧАННЯ

У маі бягучага года пры Гомельскім абласным маладзёжным фондзе быў створаны Маладзёжны фонд дзелавых ініцыятыў. Адным з асноўных відаў яго дзейнасці з'яўляецца рэалізацыя сацыяльна накіраваных праграм і праектаў.

На сённяшні дзень ён прапануе вам паслугі і льготы, якімі вы можаце карыстацца, калі станеце ўладальнікам студэнцкай карткі ISIC. Яна адкрые вам дзверы ў свет падарожжаў і прыгод, дапаможа ўбачыць шмат цікавага ў многіх краінах свету. Калі вы збіраецеся летам у доўгую паездку, хочаце наведаць сяброў у іншых краінах або проста правесці летнія канікулы за рубяжом, то менавіта міжнароднае студэнцкае пасведчанне стане вашым незаменным спадарожнікам. Яно - вынік сумеснай дзейнасці Міжнароднага Студэнцкага Саюза і Міжнароднага Студэнцкага Бюро падарожжаў. Спонсар - Міжнародная Асацыяцыя Універсітэтаў, якая аб'ядноўвае студэнтаў 120 краін свету. У большасці з іх уладальнік пасведчання мае права на 30-40-працэнтную скідку на авія- і чыгуначныя білеты, на пражыванне ў інтэрнатах і студэнцкіх гасцініцах, на льготныя білеты, на культурныя мерапрыемствы.

Калі вас зацікавіла гэта інфармацыя, вы можаце звярнуцца за падрабязнымі даведкамі да намесніка дырэктара МФДІ Аляксандра Уладзіміравіча Солгана па тэл. 53-79-92.




Так выглядае міжнароднае студэнцкае пасведчанне.

# О НРАВСТВЕННОСТИ

[illegible] слепой вере в непогрешимость основоположников и практиков. А некоторые из них прилюдно обещали светлое будущее уже если не нашим дедам и отцам, то нам непременно! И мы, соответственно, и стар, и млад, верили в это. Нам внушали: "Слушайся вождей -- будешь достойным членом нового общества!", "Все прошлое - сплошь родимые пятна капитализма", "Раз мы против капитализма -- у нас все должно быть не так!"

И мы старались, отрицая исторический опыт, знание, традиции, культуру. Вместо умения размышлять над прошлым и настоящим, учиться восхищаться красотой истинного искусства, уважать каждый талант, ценить способность подражать мудрым, отважным и честным, нас с детства учили ходить колоннами под шелест алых знамен и барабанный бой. Мы смотрели на мир с классовых позиций, а многие и сегодня продолжают смотреть с высоты этой одинокой башни, не замечая, что она опасно наклонилась, что фундамент ее, подмытый потоками вешних вод, разрушается.

Нет, мы знали с детства, что нельзя делать, но знание это не переросло в убеждение, потому что не было веры, той всесильной охватывающей душу и разум, какую давала, например, религия.

К сожалению, иного, что равноценно заменило бы ее после отторжения и разрушения и предания всенародному проклятию, не было. И подрастающее поколение наших современников все чаще обращается к "Библии" и "Евангелию", ставшими самыми популярными изданиями в 90-е годы.

С.ЖАГОРОВ,

ст.преподаватель кафедры "Правоведение".

## У ДОБРЫ ШЛЯХ!

Алег Кацапаў сёлета скончыў філфак нашага універсітэта. Нарадзіўся ён у Гомелі ў 1969 годзе. Служыў у арміі, год працаваў слесарам на заводзе.

Вершы пачаў пісаць яшчэ ў сёмым класе. А зараз іх назбіралася столькі, што аўтару пара пазнаёміць з імі не толькі блізкіх сяброў, але і чытачоў-аматараў паэтычнага слова.

У Алега выпрацоўваецца і свой погляд на свет, і свой уласны почырк.

Віктар ЯРАЦ

### "МЫ ВЕРЫМ ТОЛЬКІ Ў СЯБЕ"

*Я песні каханню спяваць адмаўляюся -*
*Не трэба вечнаму нявечнае.*
◆◆
*След.*
*След.*
*Яшчэ і яшчэ*
*Многа слядоў.*
*Сцяжынка. -*
*Вельмі лёгка ісці*
*...Трава загінула.*
◆◆
*Гляджу на зямлю -*
*Вочы мае напаўняюцца*
*слязьмі.*
*Які невыносны боль.*
*Гляджу на неба -*
*Хоць нейкая радасць:*
*там мая неўміручасць.*
◆◆
*Мы не верым у Бога.*
*Бог жыў і жыве.*
*Мы не верым у Сонца.*
*Яно свеціць.*
*Мы не верым у зоркі.*
*Яны смяюцца.*
*Мы верым толькі ў сябе,*
*толькі ў сябе.*
*І з гэтай верай паміраем.*
◆◆
*Галерны раб.*
*Як хмара медная,*
*ён хмуры, нерухомы.*
*Ёсць сілы скінуць ланцугі,*
*ёсць сілы збегчы, уцячы з няволі.*
*Крывавы слуп.*
*Агнём ударыць па спіне,*
*па галаве,*
*па твары -*
*пачнецца жвавы рух*
*распятых рук,*
*артэрый чорных,*
*белай пены,*
*маўклівых*
*сініх губ.*
◆◆
*Шэрасць і дождж,*
*промні і снег*
*кожны дзень,*
*праз дзень,*
*праз месяцы і тыдні*
*сустракаюцца*
*з маім акном -*
*відаць, прыродзе*
*не хапае розуму*
*пераступіць такую*
*аднастайнасць.*

Крытыка

## З ВЕРАЙ У ПЕРАМОЖНАСЦЬ ПАЭЗІІ

Гомельскі паэт Сяргей Сыс /Сяржук Рэчыц/ сёння яшчэ не мае выдадзеных сваіх зборнікаў твораў, але гэтае імя /выпускнік ГДУ 1991 г./ добра вядома аматарам беларускага паэтычнага слова. Вершы Сяргея Сыса друкаваліся як у мясцовым, так і рэспубліканскім друку. З"яўляецца ён і адным з аўтараў калектыўнага зборніка паэзіі, прозы і публіцыстыкі "Тутэйшыя "/ Мн., 1989 г./. Зразумела, творчасць паэта не магла не трапіць і ў поле зроку літаратурных крытыкаў. Канешне, аб нейкіх грунтоўных даследаваннях тут казаць яшчэ рана: усё яшчэ наперадзе.

У ліку ж першых, хто звярнуў увагу на творчасць Сяргея Сыса, быў крытык, былы выкладчык Гомельскага дзяржуніверсітэта Сяргей Купцоў. У сваёй рэцэнзіі на згаданы вышэй калектыўны зборнік /гл. "Бацькі ці дзеці?..", "ЛІМ", 8.06.1990 г./ ён адзначае: "...укладальнік трапна падабраў чатырохрадкоўе, што адкрывае зборнік:

*Ноч. Павуцінне сноў.*
*Дзень. Павуцінне спраў.*
*Скажаш, нібыта ўкраў*
*Некалькі нечых слоў...*

Можна было б згадаць вядомае цютчаўскае "мысль изречённая есть ложь", калі б не іронія, на мой погляд, што гучыць у гэтых радках Сержука Сыса і задае ў нейкай меры танальнасць усяму зборніку". Працягваючы разважанні Сяргея Купцова, можна сказаць, што гэтая самая "танальнасць іроніі", а больш дакладна аўтарскі філасофска-псіхалагічны падыход да рэчаіснасці, характэрны для многіх вершаў Сяргей Сыса, Так, у вершы "Сочыцца пясок бясконца ..." /"Камуніст", Жлобін/, 7.01.1989 г./ чытаем:

*...Калісьці знікнеш ты.*
*...Але жыццё на тым не згіне,*
*І Творцы Вышняга рука*
*З падатлівае злепіць гліны*
*Твой дублікат.*

А вось радкі з верша "Ноч" /"Ніва", Беласток/, 9.07.1989 г./:

*І будзе ноч, калі памруць вар'яты,*
*Пазначаныя вогненным крыжом,*
*Загіне Бог, дыктатар і схізматык,*
*А мы ад д"ябла душ не ўбярэжом.*

Згадзіцеся, апошнія два радкі выклікаюць нейкі пратэст у чытачоў. Гэта адчуў і аўтар. Таму ў новым варыянце верша /гл. "Гомельская праўда", 29.06.1991 г./ ужо чытаем:

*І наш сусвет, раздушаны і змяты,*
*Мы самі ад сябе не зберажом.*

І тым не менш, ці не пераходзіць тут "іронія" у самы што ні ёсць песімізм, ці не паддаўся аўтар адчаю, ці не згубіў веру ў пераможнасць "светлага дня". Аналізуючы творчасць Сяргея Сыса ў цэлым, можна ўпэўнена сказаць, што "не". Паэт сцвярджае гэта ў сваіх вершах "Абуджэнне", "Маё лета", "На дня зыход" і іншых. І, каб не быць галаслоўным, прыгадаем да сказанага некалькі радкоў з верша "Хадзем са мной, па шэрых тварах дзён..." /"Гомельская праўда", 22.12.1990 г./:

*Хадзем жа прэч, бяжым*
*адсюль хутчэй,*
*Яшчэ ёсць час застацца,*
*вартым Веры*
*У вечную паэзію вачэй,*
*Напоўненых спагадай і*
*даверам.*

Хацелася б спадзявацца, што гэтая вера"ў вечнасць паэзіі", яе пераможнасць, не пакіне Сяргея Сыса і ў новых творах.

**М.ШУКАНАЎ.**

### АБ АЎТАРЫ:

У 1988 годзе скончыў гісторыка-філалагічны факультэт ГДУ, працаваў настаўнікам беларускай мовы і літаратуры ў Жлобінскім раёне, з 1990 года - супрацоўнік Жлобінскай райгазеты. Апавяданні, літаратурна-крытычныя артыкулы, рэцэнзіі друкаваліся ў "Чырвонай змене", "Настаўніцкай газеце", "Ніве", "Гомельскай праўдзе", "Гомельскім універсітэце", "Тувинской правде", часопісе "Полярная звезда" /Якуцк/ і іншых.



## СТАІЦЬ УЖО ВОСЕНЬ НА ДВАРЫ




**НАШ СЁННЯШНІ РАСКАЗ АБ ТЫМ, ЯК МОДНА АПРАНУЦЦА І ШТО ДЛЯ ГЭТАГА ТРЭБА**

Адказаць на гэта пытанне дастаткова лёгка, і ў той жа час дастаткова складана. Канешне ж, агульная большасць можа ўсю восень насіць "скуру, джынсы і красоўкі", кіруючыся так званым "густам і прапановай" кааператаваў. На жаль, сябры, гэта нават ужо не ўчарашні, а пазаўчарашні дзень. Заходняя мода, у тым ліку разлічаная на сярэдняга спажыўца, даўно пайшла наперад, нягледзячы на тое, што ў нас ўсё гэта па-ранейшаму дорага і практычна. Але ... у даным выпадку, -- дорага і модна -- гэта не адно і тое ж, тым больш, што джынсы і красоўкі падыходзяць у ансамблі толькі ў тым выпадку, калі да іх апрануты джынсы або штаны ў тон, але ні ў якім выпадку не ўстарэлыя "бананы" ... Калі ж у вашым гардэробе прысутнічаюць скуранка і джынсы /або бананы/, дапоўніць гэта трэба чымсьці стылёвым з абутку: у вельмі няпросты наш час можна ўспомніць аб старых бацькоўскіх нарадах -- для гэтай мэты падыйдуць любыя вузканосыя туфлі ўзору 50-60-х гадоў, так званыя "шымі". Падыйдуць і модныя ў той час лакіраваныя туфлі. І ні ў якім выпадку не апранайце джынсы і курткі-капюшоны! Гэта прэрагатыва спартыўнага стылю! Як не дзіўна і не крыўдна, але з моды паступова выходзяць "жоўтыя чаравікі" на тоўстай падэшве, уступаючы месца сабо і туфлям на платформе.

Зніжаецца інтарэс да клубных куртак і касух -- усё гэта застаецца толькі сярод абмежаванай катэгорыі маладых людзей -- фанатаў свайго стылю. Агульная ж тэндэнцыя такая, што ўсё гэта адыходзіць на другі план, даючы прастору класічнаму. Затое ў моду зноў увайшлі пінжакі з твіду, класічныя штаны і вузкія рамяні без усялякіх упрыгожванняў і набалдашнікаў. Кашуля павінна быць аднатоннай, пажадана някідкіх таноў. Перавага аддаецца пастэльным, балотна-зялёным, тэракотавым, ліловым і бардовым танам. Ну а ў фаворы па-ранейшаму кашулі коляру марской хвалі з двумя накладнымі кішэнямі і перламутравымі гузікамі. Зноў вяртаюцца з небыцця гальштукі: вузкія і шырокія, з малюнкам і аднатонныя. Галоўнае, каб усё было падабрана ў тон. І апошняе. Чырвоныя двухбортныя

(Заканчэнне на 8 стар.)

**"...Мы часто ворчим,**
**постоянно**
**чем-то недовольны,**
**а как прекрасно -**
**смеяться и жить."**
**ЛУИ де ФЮНЕС**

## НАЧНОЕ ШОУ Ў ГОМЕЛІ

Напэўна, нямногім студэнтам нашага універсітэта вядома тое, што ў Гомелі 1 кастрычніка г.г. адбылася прэзентацыя начной дыскатэкі пад незвычайнай назвай "ЛАЙТ". Яе адкрыццё прайшло ў холе кінатэатра імя М.І.Калініна, дзе яна і абсталявалася. На прэзентацыі прысутнічалі прадстаўнікі гарсавета, маскоўскай фірмы "Арыён-Сервіс", а таксама госці: гомельскі тэатр танца "Кактэйль" і папулярны спявак Багдан Цітамір.

Адказваючы на наша пытанне аб самой назве дыскатэкі, яе дырэктар Алег Гар'евіч Рыжкоў сказаў:

- "Лайт" у перакладзе з англійскай мовы азначае свет, чысціня.

Менавіта гэтымі прынцыпамі мы і будзем карыстацца ў нашай далейшай рабоце. Таму што галоўная наша задача - захаваць добры настрой гасцей на працягу ўсяго вечара, даць магчымасць ім адпачыць, расслабіцца, адчуць сябе свабодна і раскавана.

- Усім вядома, што ў наш час для таго, каб стварыць штосьці новае, цікавае і захапляючае, трэба атрымаць неабходныя для гэтага дакументы. Як жа справы складваліся ў Вас?

- Як ні дзіўна, - адказвае А.Г.Рыжкоў, - з боку гарадскіх улад мы сустрэлі поўнае ўзаемаразуменне. Літаральна за месяц-паўтара былі сабраны неабходныя дакументы і атрыманы адпаведныя дазволы. У гэтым нам дапамаглі гарадскія ўлады, адміністрацыя кінатэатра імя М.І.Калініна і многія іншыя, каму мы выказваем шчырую ўдзячнасць.

У гэты вечар нам удалося пазнаёміцца і паразмаўляць не толькі з дырэктарам начной дыскатэкі "Лайт", але і з яго бліжэйшым сябрам і партнёрам, дырэктарам фірмы "SST"/Светавая тэхніка і тэхналогія/ У.І.Картавцавым. На наша пытанне аб катэгорыі наведвальнікаў ён заўважыў:

- Наша дыскатэка разлічана, у асноўным, на людзей з сярэднім дабрабытам. Мы не імкнемся стаць вельмі дарагой, элітарнай дыскатэкай, але ў той жа час не жадаем ператварыцца ў "уличное заведение". Як прыемна бачыць вакол сябе ветлівых і выхаваных маладых людзей, якія ўмеюць паважаць не толькі свой адпачынак, але і людзей, якія ствараюць яго.

### ВАШ АДПАЧЫНАК

- Скажыце, калі ласка, некалькі слоў аб гукавым і светавым афармленні дыскатэкі. На колькі мы зразумелі, гэта ваша сфера дзейнасці.

- Як вы самі ўпэўніліся, у нас устаноўлена навейшае светлавое абсталяванне і акустычныя сістэмы, адпавядаючыя сусветным стандартам. У гэтым нам вельмі дапамаглі нашы калегі з Масквы, асабліва фірма "Арыён-Сервіс". Дзякуючы ім, мы за вельмі кароткі час змаглі прывезці, устанавіць і наладзіць гэта абсталяванне. У той жа час фірмай "SST" была распрацавана і створана тэхнічна новая гукавая апаратура для нашай дыскатэкі.

Гаворачы аб перспектывах развіцця, Алег Гар"евіч і Уладзімір Ільіч заўважылі:

- Нам не хацелася б спыняцца на дасягнутым. Мы будзем удасканальваць праграму нашай начной дыскатэкі, запрашаць вядомых спевакоў і музыкантаў, рыхтавацца да святкавання Новага года.

- Ну і апошняе пытанне, якое, напэўна, ужо цікавіць нашых чытачоў: калі і як можна трапіць на Вашу дыскатэку?

- Праводзіць яе мы плануем па чацвяргах, пятніцах, суботах і нядзелях з 22.00 да 4 гадзін раніцы.

Білеты можна набыць у бары "Лайт", які працуе штодзённа ў холе кінатэатра імя М.І.Калініна. Бармэн таксама адкажа на цікавячыя Вас пытанні. Мы запрашаем усіх студэнтаў наведаць нашу дыскатэку і адчуць сябе шчаслівым чалавекам у поўным сэнсе слова...

**А.КАДОЛ,**
**Р.БАНЬКОЎСКІ,**
студэнты 2-га курса гісторыка-юрыдычнага факультэта.

(Заканчэнне. Пачатак на 7 стар.)

## СТАЙЦЬ УЖО ВОСЕНЬ НА ДВАРЫ

пінжакі канчаткова ўстарэлі і да месца цяпер толькі для бармэнаў і афіцыянтаў на іх рабоце. Ва ўсякім выпадку, у салідных заходніх каталогах іх няма. Іх месца трывала занялі вузкія аднабортныя пінжакі светлых таноў падоўжанага пакрою. Вышэйшы стыль гэтага сезона -- стыль "італьянскага мафіёзі": светлы пінжак, цёмная кашуля, пастэльны або карычневы гальштук і шэрыя завужаныя штаны. Пры, здавалася б, сумятні колераў, тым не менш, гэта выглядае вельмі элегантна...

Вось што прапануе капрызная дама "МОДА". У наступны раз размова пойдзе аб тым, што модна для дзяўчат і жанчын больш сталага ўзросту.

Ну а цяпер, хлопцы, калі вы апрануты адпаведна, -- наперад, на вуліцу, каб на людзей паглядзець і сябе паказаць.

**П.БЕСЯЦКІ,** вядучы рубрыкі "Лідэр".

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

## ЧЭМПІЁНЫ!

СПОРТ СПОРТ СПОРТ СПОРТ

### Першынство ВНУ па тэнісу

На тэнісных кортах стадыёна "Прамень" прайшло першынство Гомеля па тэнісу сярод каманд вышэйшых навучальных устаноў. Матчы паміж імі гуляліся з пяці сустрэч: трох у адзіночным разрадзе і дзвюх -- у парным.

У першы дзень каманда ГДУ, у якую ўваходзілі дэкан філалагічнага факультэта Уладзімір Еўтухоў, заг. кафедры вышэйшай матэматыкі Уладзімір Семянчук і дацэнт кафедры тэарэтычнай фізікі Валерый Капшай, сустракалася з камандай кааператыўнага інстытута. Гэты матч наша каманда закончыла датэрмінова з лікам 3:0. Свае адзіночныя паядынкі ўпэўнена выйгралі У.Еўтухоў і У.Семянчук, яны ж у парнай сустрэчы прынеслі і рашаючае ачко.

У другі дзень, ужо ў фінале, наша каманда сустрэлася са значна больш маладой і вельмі моцнай камандай політэхнічнага інстытута, а фізічныя кандыцыі -- рэч у тэнісе вельмі важная. Але ў камандных спаборніцтвах яшчэ вялікае значэнне мае і калектыўны дух, настрой.

Пачатак матча ГДУ-ГПІ склаўся для нас няўдала. У.Еўтухоў і У.Семянчук ва ўпартай барацьбе ўступілі ў парнай сустрэчы ў двух сетах. Аднак В.Капшай затым выйграў адзіночную сустрэчу таксама ў двух сетах і лік стаў 1:1. У дзвюх наступных сустрэчах наша каманда разлічвала ўзяць хаця б адно ачко і тады лёс матча пры ліку 2:2 рашаўся б у самай апошняй сустрэчы, дзе фактар адказнасці за каманду становіцца амаль ці не самым галоўным.

Адбылося ж іншае. У другой парнай сустрэчы У.Семянчук і В.Капшай спачатку лёгка выйграюць першы сет 6:1. Затым вядуць у ліку 4:1 у другім, але ... праігрываюць яго -- 4:6. Некалькі ўзмацніўся вецер, і моцна дасланыя мячы раз пораз клаліся побач з рысамі, але за межамі пляцоўкі. У трэцім сеце наша пара некалькі змяніла тактыку, згуляла "па тэорыі". Сталі рэгулярнымі выхады да сеткі, дзе асабліва тонка і "матэматычна" дакладна іграў з лёту У.Семянчук. Запамяталіся і некалькі яго нечаканых каварных свечак, калі саперыікі гулялі супраць сонца. У выніку тактычная перамога ў трэцім сеце -- 6:2 і другое ачко ў матчы.

Наступная адзіночная сустрэча аказалася самай працяглай у матчы. Спачатку У.Еўтухоў узяў гейм на падачы саперніка і павёў у ліку 3:1. Затым, аднак, ён праіграў "сваю" падачу і лік стаў 4:4. Але ўсё ж такі, "сабраўшыся", У.Еўтухоў выйграў два наступных геймы, а з імі і першы сет. Патраціўшы шмат сіл у першым сеце, ён пачаў наступны з пройгрышу двух геймаў, і вось ужо лік стаў 1:4. Але ў другі раз у матчы ГДУ-ГПІ гэты лік аказаўся пераломным, прычым менавіта ў другім сеце. У У.Еўтухова сталі атрымоўвацца і падачы, і прыём падачы, і, наогул, кожнае ачко ён стаў разыгрываць звышадказна. І выйграў пяць геймаў запар, а з імі другі сет і сваю сустрэчу. Матч ГДУ-ГПІ, такім чынам, завяршыўся датэрмінова з лікам 3:1.

Ва ўсіх сустрэчах матча было шмат такіх момантаў, чым і прыгожы тэніс. Гледачы не раз узнагароджвалі ўдзельнікаў апладысментамі.

Балельшчыкі і суддзі першынства ВНУ адзначалі, што калі сёння ў Гомелі правесці па таму ж рэгламенту камандныя спаборніцтвы па тэнісу не толькі сярод ВНУ, але і сярод усіх арганізацый і калектываў фізкультуры, то хутчэй за ўсё ў фінале сустрэліся б гэтыя ж каманды -- ГДУ і ГПІ. Але гэта ў будучым. А пакуль каманда ГДУ -- чэмпіён першынства ВНУ Гомеля.

**/Наш. кар./.**

**ГОМЕЛЬСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ УНІВЕРСІТЭТ імя Ф.СКАРЫНЫ**

аб'яўляе конкурс на замяшчэнне вакантных пасад па кафедрах:

-- агульнай фізікі -- дацэнта;

-- лёгкай атлетыкі і лыжнага спорту -- дацэнта (2);

-- тэорыі і методыкі фізічнай культуры -- дацэнта;

-- фізвыхавання -- дацэнта.

Тэрмін падачы заяў -- не пазней 1 месяца з дня апублікавання паведамлення.

Заявы накіроўваць на адрас: 246699 г.Гомель, вул. Савецкая, 104.

**РЭКТАРАТ.**

Аўтары надрукаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць прыведзеных фактаў, цытат, эканамічных даных, асабістых імён, геаграфічных назваў і іншай інфармацыі, а таксама за тое, каб у матэрыялах не ўтрымлівалася даных, якія не падлягаюць адкрытай публікацыі. Рэдакцыя можа друкаваць артыкулы ў парадку абмеркавання, не раздзяляючы пункту гледжання аўтара.

"Гомельскі універсітэт" -- газета Гомельскага дзяржаўнага універсітэта імя Ф.Скарыны.

Наш адрас: 246699, г. Гомель, вул. Савецкая, 104, пакой 1-18, тэл. 57-43-21.

Рэгістрацыйны № 221

Спонсары газеты -- Цэнтральны райсавет народных дэпутатаў г. Гомеля; НВП "Сучасныя тэхналогіі", прафком студэнтаў.

Газета набрана і звёрстана на настольна-выдавецкім комплексе ІВЦ ГДУ, адрукавана на Гомельскай фабрыцы "Палесдрук".

Рэдактар Ул. БАЛОГА

Аб'ём 1 друк. арк. Тыраж 1.500 экз. Заказ 830.

Падпісана да друку 21.10.94.